УДК 811.16

***І. Я. Сільчанка,***
*курсант 2-га курса факультэта міліцыі*
*Магілёўскага інстытута МУС*
*Навуковы кіраўнік: А. М. Шубадзёрава,*
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

# СТРУКТУРНА-СЕМАНТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ КАНСТЫТУЦЫЙНА-ПРАВАВОЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

Актуальнасць дадзенага даследавання абумоўлена выкарыстаннем канстытуцыйна-прававой тэрміналагічнай лексікі за межамі сферы прафесійнага ўжывання, што выклікана шырокім асвятленнем прававых пытанняў у сродках масавай інфармацыі, цікавасцю грамадскасці да палітычных праблем як унутры краіны, так і за яе межамі.

Праблема сістэматызацыі і ўдасканалення паняційна-тэрміналагічнай сітэмы актуальная для любой галіны навукі і практыкі, у тым ліку і юрыдычнай. Канстытуцыйнае права з’яўляецца адной з тых навукова-практычных абласцей, якая мае ў сваім арсенале самую шырокую і разнастайную тэрміналогію.

Адно з галоўных патрабаванняў, што прад’яўляюцца да тэрмінаў і тэрміналагічных канструкцый, — дакладнае слоўнае адлюстраванне абазначаных імі рэалій. Асаблівае значэнне мае дакладнасць тэрмінаў у нарматыўным рэгуляванні, перш за ўсё ў прававым, якое распаўсюджваецца на шырокае кола людзей, іх аб’яднанняў, арганізацый.

Матэрыялам нашага даследавання з’яўляюцца тэрміны канстытуцыйна-прававой лексікі, выбраныя са «Слоўніка юрыдычных тэрмінаў» [1]. Перш за ўсё правядзем структурна-семантычны аналіз канстытуцыйна-прававой тэрміналогіі.

Даследаванне адабранага фактычнага матэрыялу паказала, што найбольш часта сустракаюцца аднакампанентныя і многакампанентныя тэрміны, радзей — тэрміны-кампазіты.

Аднакампанентныя каранёвыя тэрміны складаюць вялікую групу тэрмінаў, што тлумачыцца іх дакладнасцю, сэнсавай адназначнасцю і функцыянальнай устойлівасцю. Акрамя таго, яны з’яўляюцца базай для пашырэння тэрміналогіі і выкарыстоўваюць тыя ж спосабы словаўтварэння, што і ў звычайнай мове:

1) суфіксацыя (*законнасць*, *суверэнітэт, галасаванне* і інш.);
2) прэфіксацыя (*незаконны, непрацаздольнасць* і інш.);

3) складанне (*правамернасць, правамоцтва* і інш.);

4) абрэвіяцыя (*юрасоба, МУС РБ* і інш.).

Адным з адметных структурна-граматычных тыпаў канстытуцыйна-прававой лексікі з’яўляюцца тэрміны-кампазіты — назвы, якія ўзніклі ў выніку аб’яднання дзвюх ці болей асноў або цэлых слоў у адно слова.

Мэтазгоднасць утварэння тэрмінаў-кампазітаў вызначаецца эканоміяй моўных сродкаў. Да найбольш прадуктыўных спосабаў утварэння субстантываваных кампазітаў належаць: 1) складанне (чыстае складанне); 2) суфіксальна-складаны спосаб; 3) абрэвіяцыя.

1. Складанне. Пры складанні адбываецца аб’яднанне двух слоў у адно без уліку суфіксаў. Пры гэтым галоўны (апошні ў слове) кампанент роўны цэламу слову, а папярэдні — аснова слова — далучаецца да галоўнага пры дапамозе злучальнай галоснай: *правапарадак, законапраект, законапарадак*.

2. Суфіксальна-складаны спосаб. Самы прадуктыўны спосаб утварэння тэрмінаў-кампазітаў, якія ўзнікаюць у выніку аб’яднання ў складанае слова двух слоў пры дапамозе злучальнай галоснай і суфіксацыі: *заканадаўства, самакіраванне, раўнапраўе, правазнаўства, працаздольнасць, народаўладдзе, рознагалоссе, правасуддзе.*

3. Абрэвіяцыя. Для прававых тэрмінаў характэрныя наступныя структурныя тыпы абрэвіятур: а) абрэвіятуры, якія ўтварыліся са спалучэння скарочанага першага слова і цэлага другога (*дзяржбюджэт, недзеяздольны, юрасоба, дзяржкантроль*); б) утварэнні з назваў пачатковых літар слоў (*ЖК РБ (Жыллёвы кодэкс Рэспублікі Беларусь), КК РБ (Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь), МУС (Міністэрства ўнутраных спраў)).*

У канстытуцыйна-прававых дакументах тэрміны-кампазіты выкарыстоўваюцца для лаканічнасці і дакладнасці тэксту, захоўвання моўнай эрганомікі, уласцівай афіцыйна-справавому стылю.

Вялікі пласт канстытуцыйна-прававой лексікі складаюць многакампанентныя тэрміны. Сярод двухкампанентных можна вылучыць два найбольш ужывальныя структурныя тыпы тэрмінаў, у склад якіх уваходзяць: 1) назоўнік і прыметнік (*канстытуцыйнае права, выбарчая сістэма, заканадаўчы працэс, палітычная сістэма, прававая сістэма* і інш.); 2) спалучэнне назоўнікаў (*правы чалавека, Міністэрства юстыцыі, свабода слова, склад урада, асобы без грамадзянства* і інш.).

Трохкампанентныя тэрміны пераважна складаюцца: 1) з прыметніка і двух назоўнікаў (*крыніцы канстытуцыйнага права, удзельнікі грамадзянскага працэсу, грамадзянскія правы і абавязкі*); 2) з назоўніка і двух прыметнікаў (*усеагульнае выбарчае права, нарматыўны прававы акт, пасіўнае выбарчае права*).

Тэрміны, у склад якіх уваходзяць чатыры і болей кампанентаў, ужываюцца значна радзей (*набыццё прыгаворам законнай сілы, канстытуцыйныя правы, свабоды і абавязкі грамадзян*).

Такім чынам, тэрміналогія канстытуцыйна-прававой лексікі разнастайная не толькі па змесце, але і па структуры.

1. Венідзіктаў С. В., Даніленка С. І. Беларуская мова. Юрыдычная лексіка : вучэб. дапам. Мінск : Выш. шк., 2019. С. 111–135. Вернуться к статье